**АЛЯКСЕ́Й**, Алёксы, Ляксей, прысвятак у народным календары. Адзначаўся 17 сак. па праваслаўным царк. календары (30 сак. па н. с.). Хутчэй за ўсё паходжанне звязана з жыццём св. Аляксія, астанкі якога пахаваны 17.3. 411 у храме св. Баніфацыя ў Рыме. На А. абавязкова плялі сеткі, бо прысвятак лічыўся днём рыбалова. У гэты ж дзень чакалі прылёту жураваў альбо буслоў, аглядалі вуллі, у некаторых раёнах пачыналі сеяць лён, авёс, выганялі скаціну на першую зеляніну. На Палессі вядома прымаўка: «На цёплага Аляксея рыба ідзе на нераст, карова на верас, а бортнік на хвою».

*Літ.*: Лозка А. Беларускі народны каляндар. Мінск, 2002. *А.Ю.Лозка.*

**АЛЯКСІ́Й II** (у свеце Рыдзігер Аляксей Міхайлавіч; 23.2.1929, Талін — 5.12.2008), расійскі праваслаўны царкоўны дзеяч. Д-р царк. гісторыі (1984), канд. багаслоўя (1955). Скончыў ленінградскія духоўную семінарыю (1949) і акадэмію (1955). З 1950 святар і настаяцель царквы ў г. Йыхві Талінскай епархіі. З 1961 епіскап талінскі і эстонскі. З 1964 архіепіскап, з 1968 мітрапаліт. З 1964 пастаянны чл. Свяшчэннага Сінода, адначасова кіраўнік спраў Маскоўскай патрыярхіі. З 1986 мітрапаліт ленінградскі і наўгародскі, з 1990 патрыярх маскоўскі і ўсяе Русі. У 1999



*Аляксій II.*

блаславіў ушанаванне царк. памяці 23 навамучанікаў Мінскай епархіі — мясцовашанаваных святых Бел. праваслаўнай царквы, якія атрымалі агульнацарк. прызнанне. Здзейсніў пастырскія візіты ў Беларусь (1991, 1995, 1998, 2001—02, 2008).

*Літ.*: Патриарх. М., 1993; Поспеловский Д.В. Русская Православная Церковь в XX в. М., 1995; Святейший Патриарх Московский и всея Руси Алексий II: (фотоальбом). М., 1999; Первосвятитель. М., 2000; Современная религиозная жизнь России. Опыт систематического описания. Т. 1. М., 2003; Никитин В.А. Светлейший патриарх Алексий II. Жизнь и деяния. М., 2009. *В.Р.Языковіч.*

*Старонкі кніг з уласнаручнымі запісамі кніжніка Аляксея.*





**АЛЯХНО́ВІЧ** Алег Міхайлавіч (н. 9.1.1940, г. Магілёў), беларускі фалькларыст, музыкант, сцэнарыст, педагог. Канд. філал. навук (1988), праф. (2003). Скончыў Маскоўскі ін-т культуры (1967). Выкладаў у Расіі. З 1975 у Бел. ун-це культуры і мастацтваў. Даследуе тэорыю і практыку нар. песеннай традыцыі, інтэрпрэтацыю нар. песні на сцэне, авалоданне нар. манерай спеваў, тэатралізацыю фалькл. песні ў сцэнічных умовах, методыку работы фалькл. калектываў, спецыфіку вывучэння рэгіянальных асаблівасцей муз. спадчыны. Абгрунтаваў тыпалогію фалькларызму ў галіне муз. мастацтва ва ўсх.-слав. фалькларыстыцы. Стварыў з І.І.Сучковым фалькл. ансамбль «Коласавы землякі» (в. Мікалаеўшчына Стаўбцоўскага р-на), маст. кіраўнік нар. фалькл. калектыву «Крынічанька» (г.п. Рудзенск Пухавіцкага р-на). Запісвае фалькл. творы («Беларуская традыцыйная музычная спадчына», 2000, і інш.). Аўтар манаграфіі «Народная песня ў мастацкай самадзейнасці» (1991), кніг «Народная песня ў школе» (2004), «Фальклор у выхаванні школьнікаў» (2008). Адзін з аўтараў дапаможнікаў «Тыпы фалькларызму ў сучаснай харавой самадзейнасці» (1990), «Беларускі музычны фальклор» (1996), «Зімовыя святы» (1999), «Веснавыя святы» (2000) і інш. Як выканаўца на дудзе ў 2000 выступаў на Міжнар. фестывалі фальклору ў Італіі.

*Тв.*: Аляхновіч А.М., Сучкоў І.І. Дапаможнік для фальклорна-этнаграфічных калектываў. Мінск, 1988; Беларускі дзіцячы фальклор [ноты]. Мінск, 1994. *В.В.Давідовіч.*

**АЛЯХНО́ВІЧ** (Olechnowicz) Мсціслаў Антонавіч (22.2.1905, г. Гродна — 24.7.1982), польскі лінгвіст. Д-р гуманітарных (1963) і пед. (1966) навук, праф. (1974). Скончыў Віленскі ун-т (1938). З 1949 працаваў у Лодзінскім ун-це. Займаўся вывучэннем бел. мовы і фальклору. Аўтар манаграфіі

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ